**САМУЙЛІК Я.Р. (г. Брэст)**

## НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ГАВОРКІ ВЁСКІ ЗАВЯЛЁЎЕ ДРАГІЧЫНСКАГА РАЁНА

Вёска Завялёўе размешчана ў межах Брашэвіцкага сельсавета, за 9 км на паўночны захад ад раённага цэнтра г. Драгічын. Паводле пісьмовых крыніц вядома з XVI ст. У 1783 г. паселішча ў складзе Брашэвіцкай воласці, уласнасць каталіцкай царквы і адносілася да Брашэвіцкай рымска-каталіцкай парафіі. У 2005 г. тут налічвалася 206 жыхароў і 94 гаспадаркі [1, с. 274; 5, с. 525].

Для запісу дыялектнага матэрыялу намі была выкарыстана праграма лінгвістычнага атласа "Гаворкі Выганаўскага Палесся. Фанетыка. Марфалогія. Лексіка", а таксама т. зв. новая праграма: "Як у вас гавораць?" [6, с. 14–18]. Дыялектны матэрыял у в. Завялёўе (мясц. назва: *Зav'іл'іv'ӱе*; жыхары: *зav'іл'іvце, зav'іл'іvыц, зav'іл'іvка)* быў запісаны ў сакавіку–красавіку 2004 г. ад мясцовых жыхароў Млынчык Сафіі Нічыпараўны, 1928 г. нараджэння, і Берднік Сафіі Філіпаўны, 1933 г. нараджэння.

Разгледзім найбольш значныя фанетычныя асаблівасці даследуемай гаворкі.

Дадзенай гаворцы ўласцівы пяць асноўных галосных фанем [а], [е], [о], [ы(и)], [у]. Характарызуе і адрознівае гэтую гаворку ў першую чаргу о к а н н е, г. зн. захаванне гістарычнага *о ў ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных: доро́hа, коро́vа, моло́ко́, си́но, vысо́ко, ли́то, же́то і інш. Адной з найбольш яркіх і паказальных адметнасцей націскнога вакалізму гэтай гаворкі з'яўляецца вымаўленне гука [а] на месцы этымалагічных *е, *h: ба́роh, vа́чур, до мина́, па́ршы, мад, да́рыvо, тыпа́р, дан', лад' 'ледзь', ида́т', ныса́т' 'ідзе, нясе', vыча́ра 'вячэра', ла́тате, ла́тайут' 'лятаць, лятаюць' і інш. [2, с. 25–27; 3, с. 218; 4, с. 209–211].

Яшчэ адна з найбольш значных і спецыфічных асаблівасцей гэтай гаворкі – гэта рэалізацыя галоснага [ө], што ўжываецца на месцы спрадвечных *ы, *і ў націскных і канцавых адкрытых паслянаціскных складах пасля цвёрдых зычных: сөн, рө́ба, vолө́, мө 'мы', hрыбө́ 'грыбы', vө́пый, помө́йу, пөл, мөш, vө́сыпаv, поhрыбө́ 'скляпы', хлыvө́, жө́то, робө́те, мө́ска, пыса́те, лоvө́те, забыра́те, ходө́те, косө́те, нө́wка, лө́па, ходө́ле, лө́те, колө́ і інш. Аднак у пераднаціскных, часам у паслянаціскных складах у падобных умовах адзначаны гук [ы]: vыта́ 'вы', hрыбө́ 'грыбы', бычо́к, vысо́ко, пыса́те, забыра́те, зыма́, vө́пый, vө́сыпаv. Галосны [ө] зафіксаваны таксама ў адпаведнасці з гістарычнымі *ę, *h, *а: пор'ө́док, мн'ө́со, помн'ө́w, бойө́wс'а 'баяўся', ж'ө́ла з ус'і́ме 'жала з усімі', ж'өр, ж'ө́ба 'жаба', ш'ө́пка і інш. [2, с. 25–27; 3, с. 218; 4, с. 209–211].

Наступнай вельмі выразнай і адрознай адметнасцю дадзенай гаворкі ў галіне націскнога вакалізму з'яўляецца вымаўленне гука [и] пасля цвёрдых зычных пераважна ў наступных пазіцыях: у адпаведнасці з націскным этымалагічным *h: лис, си́но, сниh, vи́т'ор, ли́то і інш.; на месцы спрадвечнага *о ў новых закрытых складах пад націскам звычайна пасля губных зычных: vиз, vил, бил'ш, vин, пи́дыш, кин' нату́рлыvы 'конь натурысты' і інш.; у спрадвечных спалучэннях *гы, *кы, *хы, што ўзніклі пры ўтварэнні поўных форм прыметнікаў: до́whи, коро́тки, то́нки, тө́хи. Аднак пераважна пасля пярэднеязычных на месцы націскнога *h могуць гучаць галосныя [і], [ы], на месцы *о ў складах пад націскам – гук [ы]: з'і́л'л'е, нас'і́н'н'е, ц'і́ха 'палатняная коўдра', м'і́сц'е, hрых, порысаw; ныс, стыл, корыwка і інш. Галосны [и] верхняга пад'ёму сярэдняга рада (сярэдні паміж гукамі, што абазначаюцца літарамі і і ы; ён прыкметна больш пярэдні за гук [ы] ў гаворках асноўнага масіву беларускай дыялектнай мовы, больш блізкі да яго варыянта [і] пасля мяккіх зычных) [2, с. 25–27; 3, с. 218; 4, с. 32, 151–152, 209–211].

Істотная асаблівасць гэтай гаворкі – гэта вымаўленне галоснага [ы] у першым пераднаціскным складзе ў наступных пазіцыях: на месцы гістарычных *е, *h пасля губных зычных: vысна́, быда́, vыдро́, мышо́к, пысо́к; на месцы этымалагічных *е (*ь) пасля спрадвечных *с, *з, *т, *н, *д: сыло́, зымл'е́, тыпа́р, ныма́, дын'о́к [4, с. 151].

Характэрнай прыкметай гаворкі з'яўляецца наяўнасць гука [а] на месцы гістарычнага *ę ў пераднаціскных складах у словах тыпу vз'ала́, hл'ади́w. І нарэшце, адрозная адметнасць даследуемай гаворкі ў галіне вакалізму – гэта вымаўленне галоснага [о] на месцы націскнога і паслянаціскнога этымалагічнага *е адпаведна ў наступных лексемах: дал'о́ко, оv'о́с, ба́роh, але vа́чур.

Найбольш яркая і значная асаблівасць сістэмы кансанантызму дадзенай гаворкі – гэта рэалізацыя толькі цвёрдых зычных у наступных умовах: губныя цвёрдыя перад спрадвечнымі *е /ва ўсіх пазіцыях/, *h /у ненаціскных складах/, *і, гістарычныя *с, *з, *т, *н, *д, *л – перад этымалагічнымі *е (*ь), *і: vысна́, ба́роh, vа́чур, до мына́, па́ршы, быда́, vыдро́, мышо́к, пысо́к; робө́те, мө́ска, пыса́те, лоvө́те, забыра́те; сыло́, зымл'е́, тыпа́р, ныма́, дын'о́к; ходө́те, косө́те, зыма́, нө́wка, лө́па, ходө́ле, лө́те, колө́. Аднак перад націскным *h зычныя як цвёрдыя, так і мяккія: лис, си́но, сниh, vи́т'ор, ли́то, hрых, порысаw, з'і́л'л'е, нас'і́н'н'е, ц'і́ха 'палатняная коўдра', м'і́сц'е, перад *о ў новых закрытых складах пад націскам – цвёрдыя: vиз, vил, бил'ш, vин, пи́дыш, ныс, стыл, корыwка і інш.

Паказальнай адметнасцю вывучаемай гаворкі з'яўляецца таксама ацвярдзенне спрадвечных "паўмяккіх" *д˙, *т˙ перад *е, *і, гістарычных мяккіх *д', *т' перад *h: дан', тыпа́р, тө́хо, ходө́те; дид, тин'. Этымалагічны ж мяккі *т' захаваўся на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку: vин хо́дыт', но́сыт', vонө́ хо́д'ат', но́с'ат'. У спрадвечных спалучэннях *гы, *кы, *хы, што ўзніклі пры ўтварэнні поўных форм прыметнікаў, а таксама ў пазіцыі перад галосным [е] ў прыметніках ніякага роду адзіночнага ліку зычныя захаваліся цвёрдымі: до́whи, коро́тки, то́нки, тө́хи, до́ўhө, коро́ткө, тө́хө. Істотная асаблівасць разглядаемай гаворкі – гэта як цвёрдыя, так і мяккія гістарычныя зычныя *р, *ж, *ш, *ц у пэўных пазіцыях: hрых, порысаw, hрад$^т$, жө́то, на мыжы́, жырыбө́ 'жарабя', ожө́на 'ажыны', жабө́ kvа́кайут', лукашы́ 'буякі, дурніцы', vул'шө́на 'вольха, алешына', цөп, хло́пцө, молодө́ца, hу́лыца 'вуліца' і пор'ө́док, ж'ө́ла з ус'і́ме 'жала з усімі', ж'өр, ж'ө́ба 'жаба', ш'өпка, ц'і́vка, ц'а́ц'ка і інш. Аднак шыпячы *ч паслядоўна зацвярдзеў: hо́че, чыпө́те 'чапаць', па́дчырыца 'падчарыца, падчарка', чыры́н' 'чарэнь' і інш. [2, с. 25–27; 3, с. 218; 4, с. 152].

Вельмі выразнай рысай гаворкі з'яўляецца зычны [в], што паходзіць з *в, *л. У пазіцыі перад галосным ён рэалізуецца ў губна-зубны [v]: vа́та, vо́да, vи́т'ор, vылкө́, плыvу́, сvобо́дны і інш. Сустракаецца губна-зубны [v] і ў пачатковым становішчы перад зычнымі: vз'ала́, v ха́те, v ли́се, v по́ле і інш. Аднак у пазіцыі пасля галоснага гука перад зычным і ў канцавым становішчы зычны [в] (<*в, *л) пераважна даў рэфлекс губна-губнога [w], часам – паўгалоснага [ў]: ла́wка, пра́wда, до́whи, купө́w; доўhе, ки́шка м'а́ўкайе, м'а́ўчөт' 'кошка мяўкае', то́ўча 'таўчоная бульба (пюрэ)' [3, с. 218; 4, с. 153].

Яркая і адрозная асаблівасць гэтай гаворкі – вымаўленне фарынгальнага (глотачнага) зычнага [h]: hусты́, hо́род$^т$, hуро́к, hаду́ка, hрад$^т$, доро́hа, з ноhө́, ба́роh і інш. [4, с. 153]. Значнай адметнасцю гаворкі з'яўляецца і тое, што ў канцавым становішчы, а таксама ў сярэдзіне слова перад глухімі звонкія зычныя аглушаюцца толькі часткова: дуб$^п$, vиз$^с$, ныж$^ш$, hо́лод$^т$, ка́з$^с$ка, зага́д$^т$ка, hу́б$^п$ка, ны́ж$^ш$ка, коц'у́б$^п$ка 'качарга'. Зрэдку ў падобных умовах звонкія зычныя захаваліся: дид, па́дчырыца 'падчарыца, падчарка', подстыж'йе 'месца, дзе стаяў стажок'. Яшчэ адна паказальная асаблівасць гэтай гаворкі – фанетычнае падаўжэнне зычных у інтэрвакальным становішчы на месцы этымалагічнага спалучэння "мяккі зычны + ьj": з'і́л'л'е, нас'і́н'н'е. І нарэшце, выразнай і істотнай адметнасцю даследуемай гаворкі ў галіне кансанантызму з'яўляецца пашырэнне ў пераважнай большасці слоў перад галоснымі [о], [а] [у] пратэтычнага [h]: hо́стры, hо́сын', hо́че, hора́те, ныhо́дноhо, hарабө́на 'рабіна', hу́лыца 'вуліца', але vул'шө́на 'вольха, алешына', ану́ча, о́зиро. У заключэнне для больш поўнага ўяўлення аб гаворцы в. Завялёўе Драгічынскага раёна прывядзём невялікі тэкст.

Жнө́vо

Ой hукну́ ж бо йа v бору́,
Пода́м hолосо́чок та додо́му.
Хто v мына́ до́ма дому́йе,
Хто мый hолосо́к почу́йе?
Ма́т'унка v до́ма дому́йе,
Vона́ мый hолосо́к почу́йе,
Vона́ мни vыча́ру зhоту́йе.

*Сма́чна vыча́ра, hалуше́.*
*Поста́лыт' пости́л'ку, подуше́,*
*Vыча́рай, до́н'у, hалушке,*
*Л'аже́с'а спа́те v подуше́.*
*Мыни́, ма́тко, vыча́ра ныме́ла,*
*Мына́ па́нскайа не́vа vтоме́ла.*

Такім чынам, гаворка в. Завялёўе Драгічынскага раёна характарызуецца значнай колькасцю фанетычных асаблівасцяў і адносіцца да тараканскіх гаворак, аднаго з чатырох асобных тыпаў (разнавіднасцяў) заходнепалескіх, або загародскіх, гаворак [2, с. 25–27; 3, с. 218; 4, с. 150–153, 201–214].

ЛІТАРАТУРА


1. Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. – Т. 3, кн. 1. Брэсцкая вобласць / рэдкал. : Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2006. – 528 с. : іл.
2. Клімчук, Ф.Д. Гаворкі Заходняга Палесся: фанетычны нарыс / Ф.Д. Клімчук ; [рэд. М.І. Талстой] ; Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 126 с.
3. Клімчук, Ф.Д. Заходнепалескія гаворкі / Ф.Д. Клімчук // Беларуская мова : энцыклапедыя / пад рэд. А.Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1994. – С. 218–219.
4. Крывіцкі, А.А. Дыялекталогія беларускай мовы : дапам. для філал. спецыяльнасцей ВНУ / А.А. Крывіцкі. – Мінск : Выш. шк., 2003. – 293 с.
5. Памяць : гіст.-дак. хроніка Драгіч. р-на : / уклад. С.А. Супрун ; рэдкал.: Я.Я. Аляксейчык [і інш.] – Мінск : БелТА, 1997. – 572 с.
6. Самуйлік, Я.Р. Гаворкі Выганаўскага Палесся : лінгвіст. атлас для студэнтаў філал. фак. ун-та / Я.Р. Самуйлік ; Брэсц. дзярж. ун-т. – Брэст : БрДУ, 2009. – 199 с.